ГУК «Могилёвская районная сеть публичных библиотек»
центральная библиотека

# «РОДНАЯ МОВА – КРЫНІЦА ПРАЗРЫСТАЯ»

віртуальная выстава,
прысвечаная Міжнароднаму дню роднай мовы

Буйничи 2021


Уладзімір Караткевіч
Каласы пад сярпом тваім
Мая беларуская кніга
Іван Мележ
Людзі на балоце
Мая беларуская кніга
Іван Шамякін
Атланты і карыятыды
Уладзімір Караткевіч
Чорны замак Альшанскі
Янка Маўр
Палескія рабінзоны
Бібліятэка прыгод і фантастыкі
А. М. Ненадавец
Міфалогія роднага краю
Школьная бібліятэка
Кандрат Крапіва
Хто смяецца апошнім
Камедыі




# Уладзімір Караткевіч
# «Каласы пад сярпом тваім»

“Каласы пад сярпом тваім” – гэта тая кніга, якую павінен прачытаць кожны беларус, каб зразумець сябе, адчуць свае карані. Іншым зразумець гэты раман будзе даволі складана. Толькі беларус можа адчуць да апошняй кроплі гэты боль па страчанай волі, зруйнаванай мове і культуры. Што нам за шчасце такое выпала? Нават ужо не ў такім і далёкім XIX стагоддзі не разумелі мы яшчэ, хто мы такія, хто мы і што мы на гэтай зямлі? Гэта кніга дапамагае нам асэнсаваць, что мы маем сваю зямлю, мову, культуру, что мы – беларусы, а не проста тутэйшыя. Заўважце, як моцна здзіўляліся ўсе, калі ці Алесь, ці Кастусь, ці іншыя хлопцы з суполкі “Братэрства чартапалоху і шыпшыны” называлі сябе беларусамі.

**«Хто не памятае мінулага, хто забывае мінулае – асуджаны зноў перажыць яго. Безліч разоў.»**




# Іван Мележ
# «Людзі на балоце»

Раман «Людзі на балоце» Івана Мележа — першая частка «Палескай хронікі» — адна з вяршынь беларускай літаратуры. Пра «Палескую хроніку» І. Мележа, пра не толькі ягоную, але і ўсёй нашае прозы Галоўную кнігу, пра гэты «найвышэйшы ўзор усей беларускай пасляваеннай прозы» (Б. Макмілін), пра гэтую адну з самых «высокіх і сонечных вяршынь беларускай савецкай літаратуры» (П. Панчанка) ужо напісана, бадай, як ні пра які іншы наш раман. Людзі, чуйныя да Праўды і Прыгажосці, яшчэ ў рукапісе любаваліся, «як хораша і ўдумна ўсё зроблена, як тонка, дасціпна і глыбока. І як праўдзіва і адчувальна…»



**«Мова – гэта вялікі народны скарб. Яго нельга не паважаць, як нельга не паважаць родны народ.»**




# Аляксей Ненадавец
# «Міфалогія роднага краю»

У кнізе аналізуецца міфалогія беларускага народа і паказана яе адлюстраванне ў разнастайных відах і жанрах традыцыйнай вусна-паэтічнай творчасці. Разгледжаны жанравыя асаблівасці, ідэйна-тэматычны змест. Разлічана на работнікаў навуковых і культурна-асветных устаноў, выкладчыкаў вышэйшай і сярэдняй школы, аспірантаў і студэнтаў, а таксама ўсіх тых, хто цікавіцца беларускай міфалогтяй.






# Іван Шамякін «Атланты і карыятыды»

Максіму Карначу — 47. Пазнавата для крызісу сярэдняга ўзросту, але якраз нешта падобнае ў яго жыцці наступіла. І прычынай таму была не "другая жанчына", як звычайна, а наадварот "жанчына свая" — жонка Даша, чые істэрыкі і рэўнасць дайшлі ўжо да краю. Спакой можна знайсці толькі праз развод. Але часы стаяць партыйныя, сваяк Дашы — старшыня гаркома, і асабістыя справы галоўнага архітэктара горада Максіма Карнача будуць мець буйныя наступствы не толькі для яго, але і для яго акружэння, ўвогуле амаль для ўсяго горада. Раман, напісаны сорак гадоў таму, калі апусціць радкі аб партыйным сумленні, чытаецца надзіва сучасна. Праблема маральнага выбару стаіць перад кожным пакаленнем.

**«Калі маеш шчасце, дык, мабыць, заўсёды баішся яго страціць.»**




# Уладзімір Караткевіч «Чорны замак Альшанскі»

«Чорны замак Альшанскі» - класічны беларускі дэтэктыў. У ім, як і ў іншых творах Караткевіча, выяўляецца містычная повязь часу. Нездарма галоўны герой гэтага знакавага для беларускай культуры рамана Антон Космiч кажа: «Хто не памятае мінулага, хто забывае мінулае - асуджаны зноў пераажыць яго. Безліч разоў». Для Космiча пошукі скарбаў роду Альшанскіх ператвараюцца не толькі ў цікавую прыгоду, але і ў барацьбу за ўстанаўленне праўды і справядлівасці, у якой яму дапамагаюць самыя розныя персанажы: супрацоўнік органаў дзяржаўнай бяспекі, святы айцец, вартаўнік замка і касцёла, кіраўнік археалагічнай экспедыцыі. Гэта адзін з найвядомейшых твораў Уладзіміра Караткевіча.

**«Рабі нечаканае, рабі, як не бывае, рабі, як ня робіць ніхто – і тады пераможаш.»**




# Янка Маўр
# «Палескія рабінзоны»

Навучэнцы тэхнікума — 17-18-гадовыя юнакі Мірон і Віктар — на вясновых вакацыях адправіліся ў падарожжа па залітым разводдзем Паслессі. Ледзь жывымі дапаўзлі яны да высокай зямлі, якая аказалася бязлюдным востравам пасярод залітых вадой балот. Нягледзячы на вельмі складанае становішча, Мірон і Віктар не адчаіліся і здолелі наладзіць самы просты, але неабходны для выжывання быт: з дапамогай трэння атрымалі агонь, які ратавалі ад навальніцы; спражку папругі прыстасавалі пад нож; узвялі будан, злучыўшы вершаліны алешын; адгарадзілі затоку — садок для рыбная гаспадаркі. Закон Архімеда падказаў ім, як выбрацца з багны, а вопыт старажытных, як зляпіць гаршчок.

**«Адразу з галавы, без практыкі, не надта выдумаеш.»**




# Кандрат Крапіва «Хто смяецца апошнім»

Вельмі цікавае і поўнае разважанне на тэму неўміручасці - бясконцавага жыцця. Калі б сёння раптам гэта стала магчымым? Разглядаюцца этычныя, дэмаграфічныя праблемы (і, мабыць, болей, але не такі глыбокі я аналітык). Карацей кажучы, калі хто хоча падрыхтавацца да дэбатаў на адпаведную тэму, яму сюды. Увогуле, п'еса напісана (і адыграна) вельмі... якасна. І цікава. Не чакаеш такога ад аўтара з "абрыдлых" беларускіх класікаў, але вось, могуць, і добра. З павагай і гонарам я зараз стаўлюсь да Крапівы. П'еса запісана дастаткова даўно, у 1995 годзе. Якасць запісу не выдатная, і спачатку трохі адтурхоўвае наўцямная песня, але слухайце далей, не пашкадуеце.

**«Я пра многае не мару. Хоць нямнога зрабіць, але каштоўнага.»**